_E09AfSMPtYJWmS4jLgDwlJ2To3BaQrkJouAzxtrhQXfjR1YizIOEN-Tyzvw. – Дата доступа: 28.03.2022. – Изд. на кит. яз.: 中国新闻网.

**Д. А. Кашкур,** *аспірант.*
Навуковы кіраўнік – **Т. А. Джумантаева,**
*кандыдат культуралогіі, дацэнт*

# КАМУНІКАЦЫЙНЫЯ ПРАКТЫКІ АКТУАЛІЗАЦЫІ ПОМНІКАЎ КНІЖНАЙ КУЛЬТУРЫ Ў МУЗЕІ-БІБЛІЯТЭЦЫ СІМЯОНА ПОЛАЦКАГА

25 сакавіка 1994 г. у Полацку быў урачыста адкрыты Музей-бібліятэка Сімяона Полацкага. Ужо на наступны дзень ён прыняў сваіх першых наведвальнікаў [2, с. 58]. Адкрыццё такога музея менавіта ў Полацку было заканамерным, бо гэты горад з’яўляецца радзімай знакамітага асветніка.

Думка пра неабходнасць стварэння асобнай экспазіцыі, прысвечанай Сімяону Полацкаму, узнікла падчас распрацоўкі канцэпцыі Музея беларускага кнігадрукавання і была агучана падчас адкрыцця апошняга 8 верасня 1990 г. доктарам філасофскіх навук Ю. Лабынцавым [2, с. 58–59]. Аўтарамі навуковай канцэпцыі сталі В. Д. Краско і В. І. Траццякова, мастацкае афармленне належыць І. Куржалаву [5, с. 103].

Размясціўся музей пад адным дахам з Музеем беларускага кнігадрукавання – у сценах помніка архітэктуры канца XVIII ст., які раней належаў Полацкаму Богаяўленскаму мужчынскаму манастыру, а менавіта ў тым з памяшканняў, дзе раней знаходзілася цёплая царква, асвечаная ў гонар Св. Кацярыны. Яшчэ з XVI ст. на месцы мураванага будынка існавала драўляная пабудова, у якой знаходзілася брацкая школа, дзе вучыўся, а потым і выкладаў Сімяон Полацкі [5, с. 104]. Такім чынам для музея было абрана месца, якое непасрэдна звязана з жыццём і дзейнасцю асветніка.

Сёння Музей-бібліятэка Сімяона Полацкага з’яўляецца адным з 11 філіялаў Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Плошча экспазіцыі складае 134,5 кв. м. У музеі экспануецца 141 музейны прадмет [3]. Музей з’яўляецца комплексным: яднае ў сабе рысы гістарычнага, мемарыяльнага і літаратурнага музеяў [1, с. 46].

Інтэр’ер Музея-бібліятэкі Сімяона Полацкага афармлены ў стылі заходнееўрапейскай бібліятэкі канца XVII – пачатку XVIII ст. Кнігі змешчаны ў драўляных шафах у два паверхі, над імі – бюсты філосафаў, зробленыя з гіпсу, пасярэдзіне памяшкання стаіць вялікі глобус, сцены музея аздабляюць копіі фігурных вершаў Сімяона Полацкага [5, с. 104].

Музей аб’яднаны з навуковай бібліятэкай і чытальнай залай. Тут захоўваецца фонд навуковай бібліятэкі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка, прадстаўлены кнігі па гісторыі, мастацтвазнаўстве, філалогіі, музеязнаўстве і музейных калекцыях, айчынныя і замежныя перыядычныя выданні па археалогіі, гісторыі, музейнай справе і г. д. Акрамя таго, у чытальнай зале можна працаваць з рукапіснымі кнігамі, старадрукамі і друкаванымі выданнямі, якія з’яўляюцца часткай музейнага збору [1, с. 45].

Экспазіцыя музея распавядае пра жыццё, педагагічную, літаратурную і выдавецкую дзейнасць Сімяона Полацкага. Сярод экспанатаў – рукапісы асобных вершаў і рукапісныя зборы вершаваных твораў асветніка, друкаваная прадукцыя заснаванай Сімяонам Полацкім у Маскве Верхняй друкарні, сучасныя навуковыя даследаванні яго спадчыны, а таксама найноўшыя перавыданні яго твораў. Найбольшую каштоўнасць уяўляюць арыгіналы кніг Сімяона Полацкага, выдадзеныя ў Маскве: «Тестамент» (1680), «Вечеря душевная» (1683), «Жезл правления» (1753) [3].

Падчас азнаямлення аўдыторыі з помнікамі кніжнай культуры, прадстаўленымі ў экспазіцыі Музея-бібліятэкі Сімяона Полацкага, адбываецца працэс камунікацыі. Камунікацыя можа здзяйсняцца праз фігуру медыятара (супрацоўніка музея) і адбывацца падчас экскурсій, музейна-педагагічных заняткаў і розных мерапрыемстваў. Вялікую запатрабаванасць у наведвальнікаў маюць экскурсіі па асноўнай экспазіцыі музея. Так у 2019 г. экскурсійных наведвальнікаў у музеі было больш за 13 тыс. [1, с. 46].

На базе Полацкага музея-запаведніка распрацаваны цыкл музейна-педагагічных праграм для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту, якія рэалізуюцца ва ўсіх філіялах запаведніка, у тым ліку ў Музеі-бібліятэцы Сімяона Полацкага.

Залы Музея-бібліятэкі задзейнічаны на музейна-педагагічных занятках «Запрашаем у свет кнігі» (для дзяцей 5-ці год), «З гісторыі пісьмовых прылад» (для дзяцей 6-ці год), «Як вучыліся дзеці раней» (для дзяцей 8-мі год), якія пачынаюцца ў экспазіцыі Музея беларускага кнігадрукавання. У мінулым годзе быў распрацаваны сцэнарый музейна-педагагічных заняткаў «Сімяон Полацкі: муж дабраверны, кніжнай справе верны» (для дзяцей 9-ці год), на якіх гаворка ідзе не толькі пра асобу славутага палачаніна, яго светапогляд, але і пра рукапісныя і друкаваныя кнігі Сімяона Полацкага, прадстаўленыя ў музейнай экспазіцыі, гучаць вершы асветніка, а таксама сучаснае выкананне «Псалтыра рыфматворнага». Музейныя заняткі будуюцца на тэхналогіі edutainment – навучання праз забаву, падчас такіх заняткаў наведвальнікі замацоўваюць веды на практыцы. Так на занятках «Сімяон Полацкі: муж дабраверны, кніжнай справе верны» дзецям прапануецца запісаць радкі, створаныя Сімяонам у яго ўлюбёных формах: зоркі, сэрца і крыжа [4].

Сярод камунікацыйных практык актуалізацыі помнікаў кніжнай культуры вызначаюцца музейныя мерапрыемствы: прэзентацыі новых набыткаў музея і творчыя сустрэчы з навукоўцамі і пісьменнікамі Беларусі. Кожны год музей прымае ўдзел у Міжнароднай акцыі «Ноч музеяў». З 1999 г. кожныя пяць год на базе Музея-бібліятэкі Сімяона Полацкага праводзіцца навуковая канферэнцыя «Сімяон Полацкі: светапогляд, грамадска-палітычная і літаратурная дзейнасць», якая збірае навукоўцаў і аматараў гісторыі дзеля абмеркавання вынікаў сваіх даследаванняў жыцця і спадчыны знакамітага палачаніна, гістарычнай і культурнай сітуацыі, якая панавала ў часы Сімяона Полацкага, пытанняў ушанавання яго памяці. Асобая ўвага падчас канферэнцыі заўсёды надаецца кнізе, як культурнай з’яве: супрацоўнікі музеяў і бібліятэк дзеляцца вопытам па пытанні захавання, прэзентацыі і інтэрпрэтацыі кніжных помнікаў. Падчас апошняй канферэнцыі, што адбылася ў 2019 г., працавала выстава арыгінальных выданняў Сімяона Полацкага, падрыхтаваная сумесна з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі і Цэнтральнай навуковай бібліятэкай Нацыянальнай акадэміі навук [6].

Камунікацыю праз матэрыяльныя носьбіты, якія замяняюць фігуру медыятара (супрацоўніка музея), забяспечваюць эксплікацыі, інфакіёскі, аўдыягіды, прадстаўленыя непасрэдна ў музеі, а таксама на платформе izi.TRAVEL, брашура-спадарожнік. Гэтымі матэрыяламі карыстаюцца індывідуальныя наведвальнікі музея, якіх у 2019 г. было больш за 10 тысяч [1, с. 46].

Знешняя камунікацыя адбываецца дзякуючы інфармацыйна-камунікатыўным тэхналогіям і рэалізоўваецца найперш праз афіцыйны сайт музея. Музей-бібліятэка Сімяона Полацкага прадстаўлена на сайце museum.by у выглядзе карткі памерам у адну вэб-старонку, якая не мае дадатковых раздзелаў. Зараз супрацоўнікі музея распрацоўваюць новую канцэпцыю сайта, бо стала відавочнай неабходнасць актуалізаваць інфармацыю аб музеі, падаць яе ў зручным канцэнтраваным выглядзе на афіцыйнай старонцы ў сеціве Інтэрнэт.

Папулярызацыя кніжнай спадчыны, што захоўваецца ў Музеі-бібліятэцы Сімяона Полацкага, адбываецца праз публікацыю артыкулаў пра музей і яго экспазіцыю, спецыяльныя праекты, відэаздымкі і інтэрв'ю, якія з'яўляюцца ў выніку супрацоўніцтва музея з тэлеканаламі і радыё; інфармацыя пра найбольш каштоўныя выданні размешчана таксама на старонках музейных выданняў.

---

1. *Гаўрылава, С. В.* Музей-бібліятэка Сімяона Полацкага як унікальная мемарыяльная прастора / С. В. Гаўрылава // матэрыялы V Міжнар. навук. канф. «Сімяон Полацкі: светапогляд, грамадска-палітычная і літаратурная дзейнасць», Полацк, 21–22 лістап. 2019 г. / Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік ; уклад. С. В. Гаўрылава. – Мінск, 2019. – С. 43–47.

2. *Краско, В. Д.* Музей-бібліятэка Сімяона Полацкага: ад ідэі да рэальнага жыцця / С. В. Краско // матэрыялы II Міжнар. навук. канф. «Сімяон Полацкі: светапогляд, грамадска-палітычная і літаратурная дзейнасць», Полацк, 18–19 лістап. 2004 г. / Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік ; уклад. А. У. Шумовіч [і інш.]. – Полацк, 2005. – С. 58–64.

3. Музей-бібліятэка Сімяона Полацкага [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://simeon.polotsk.museum.by/be. – Дата доступу: 30.03.2022.

4. Музейныя заняткі // Музей беларускага кнігадрукавання [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://book.polotsk.museum.by/be/node/49796. – Дата доступу: 29.03.2022.

*5.* Полацк музейны : фотаальбом / аўтар тэксту і ўклад. Т. А. Джумантаева. – Мінск : Беларусь, 2020. – 333 с.
*6.* V Міжнародная навуковая канферэнцыя «Сімяон Полацкі: светапогляд, грамадска-палітычная і літаратурная дзейнасць» // Музей беларускага кнігадрукавання [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://book.polotsk.museum.by/be/node/47835. – Дата доступу: 30.03.2022.

**О. С. Костыко,** *соискатель.*
Научный руководитель – **Е. Е. Корсакова,**
*кандидат искусствоведения, доцент*

## ЯКУБ КОЛАС И ЕГО ГЕРОИ: ПРЕЗЕНТАЦИЯ ОБРАЗА В ИЗОБРАЗИТЕЛЬНОМ ИСКУССТВЕ БЕЛАРУСИ

В произведениях разных видов искусства образы литературных героев и личность автора, создавшего их, трансформируются, приобретают особый смысл, раскрывают внутреннюю глубину. Презентация литературной классики с помощью средств выразительности, доступных, например, живописи или скульптуре, влияет на эмоциональное восприятие зрителя, оказывая всестороннее воздействие на его чувства, возбуждая интерес к произведению и его автору.

Образ Якуба Коласа наиболее полно раскрывается в жанре портрета.

Портрет – жанр искусства, посвященный изображению конкретного человека или группы людей. Портрет характерен главным образом для станкового искусства, но портретные изображения могут быть воплощены в монументальной и декоративной скульптуре и живописи [1, с. 463]. В жанре портрета внимание автора полностью сконцентрировано на человеке. От портрета требуется передать индивидуальное сходство с моделью. Воспроизводя индивидуальный облик человека, художник раскрывает его внутренний мир, сущность характера. Смысл задумки художника заключается в том, чтобы показать на холсте не только внешний вид модели, но и раскрыть неуловимые особенности характера, перипетии его биографии, погрузиться во внутренний мир человека. С технической точки зрения изобразительное искусство в состоянии передать только облик объектов, их внешнюю оболочку, но ценность художественного живописного образа состоит именно в том, что